





**“Таямніцы Мірскага замка. Падарожжы па сівых мурах з Адамам Міцкевічам”, “Таямніцы Нясвіжскага замка. Падарожжа ў глыб стагоддзяў з Уладзіславам Сыракомлем” - кнігі пра найбольш значныя і займальныя старонкі гісторыі Міра і Нясвіжа, роду Радзівілаў. Аўтар асабліва засяроджвае ўвагу на тайнах і загадках замкаў, па-свойму спрабуючы іх разгадаць.**

**Раман “Каралева не здраджвала каралю” - займальны аповед пра прыгоды і каханне 17-гадовай беларускай князёўны Соф’і Гальшанскай і 70-гадовага вялікага князя літоўскага і караля польскага Ягайлы. У рамане цесна пераплецены палітыка і каханне, інтрыгі і канфлікты.**




**“Раскіданае гняздо крывіцкай славы” – кніга пра славуты на ўсё Вялікае княства Літоўскае Крэўскі замак і яго насельнікаў. А з гісторыяй Крэўскага замка звязаны лёсы вялікіх князёў літоўскіх Альгерда, Ягайлы, Вітаўта, Кейстута, імёны іншых гістарычных асобаў.**

**У другой частцы кнігі падаецца хроніка Ягайлавага часу -- багаты і цікавы дакументальны матэрыял пра Вялікае княства Літоўскае часу Ягайлы.**

**Дакраніцеся і вы да таямніц гісторыі на старонках кніг Анатоля Бутэвіча!**



**Складальнік і камп’ютарная апрацоўка:
Гулеўская Н.В.**

# Роская гарпасялковая бібліятэка



# *Таямніцы гісторыі ў творах Анатоля Бутэвіча*

## Да 70-годдзя з дня нараджэння

**2018**

## Анатоль Бутэвіч(1948)



Імя пісьменніка Анатоля Бутэвіча добра вядома ў культурніцкіх колах Беларусі.

Анатоль Іванавіч (нарадзіўся 15 чэрвеня 1948 г., псеўданім: Максім Валошка) — беларускі дзяржаўны дзеяч, пісьменнік, перакладчык, публіцыст, крытык. Друкавацца пачаў у 1969 годзе.

На пачатку 90-х гадоў, калі Беларусь стала суверэннай дзяржавай, Анатолю Іванавічу выпала заняць высокія дзяржаўныя пасады: ён быў старшынёй Дзяржкамітэта Беларусі па друку, потым узначальваў Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры і друку. З 1996 года – генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Гданьску (Польшча), а ў 1998-2000 г.г. – пасол Рэспублікі Беларусь у Румыніі.

Менавіта тады, знаходзячыся за межамі краіны, глыбока адчуў неабходнасць заняцца папулярызацыяй гісторыі Беларусі. “Многія за мяжой мала ведаюць пра Беларусь, — сведчыць Анатоль Іванавіч. – У гэтым ёсць і наша віна, бо мы павінны мець свой гонар, годнасць за сваю гісторыю, за яе выбітных асоб. Тады павага ў свеце да нас будзе большай”.

Вярнуўшыся пасля Румыніі і вырашыў заняцца гістарычнай тэматыкай. Так з’явілася серыя гістарычных апавяданняў пад назвай “Сем цудаў Беларусі”, куды ўвайшлі такія, як “У гасцях у вечнасці”, “Званы Нямігі”, “Адвечны покліч Радзімы”. Пісалася гэтая серыя для дзяцей, але яе з вялікай цікавасцю сустрэлі і дарослыя. Нават з далёкай Канады ад нашых суайчыннікаў прыходзілі да аўтара просьбы, каб даслаў ім выдадзеныя кнігі і каб працягваў расказваць пра гісторыю Беларусі.










Чарговыя кнігі з серыі “Сем цудаў Беларусі” прысвечаны:




“Перуновага племені дзеці” - таму, што было даўней — яшчэ да хрысціянства, сёння шмат з таго даўняга стала міфамі, легендамі, захоўваецца ў якасці народных звычаяў і свят;




“Славутыя родам сваім”- лёсам некаторых прадстаўнікоў даўніх і знакамітых родаў, што жылі на беларускай зямлі: яны праславіліся ратнымі подзвігамі, мудрай дзяржаўнай і палітычнай дзейнасцю ў Вялікім княстве Літоўскім і Каралеўстве Польскім;




“За наміткай гісторыі” - выбітным і неардынарным постацям, якіх нарадзіла беларуская зямля; архітэктурным помнікам, што сведчаць аб высокім майстэрстве беларускіх дойлідаў.